УДК316.277.4:316.728(4)"185/195"

*В. С. Сідаровіч*

# Канцэпт паўсядзённасці ў еўрапейскай культуралагічнай думцы (сярэдзіна XIX – другая палова XX стагоддзя)

*Разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця канцэпту «паўсядзённасць» і актуальныя падыходы да яго даследавання, што склаліся ў замежнай і айчыннай сацыяльна-гуманітарнай навуцы. Вызначаюцца сутнасць, змест і асаблівасці паўсядзённасці, якія праяўляюцца ў стаўленні чалавека да жыццёвых з'яў ва ўзаемасувязі з сацыяльна-культурнымі працэсамі. Раскрываюцца погляды прадстаўнікоў этнаграфічнага і гістарычнага этапаў вывучэння феномена паўсядзённасці, што адпавядае пазітывісцкаму і фенаменалагічнаму кірункам у філасофіі, а таксама даследаванням школы «Аналаў».*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу стагоддзяў у еўрапейскай культуры адбываўся пошук сродкаў і паступовае фарміраванне сістэмы, якая дапамагла б найбольш дакладна і ў той жа час вобразна апісаць жыццё чалавека. У розныя перыяды феномен, які ў будучым атрымае назву «паўсядзённасць», выступаў у якасці набору практык, асаблівай формы існавання і нават як пэўная сацыяльная моц, што імкнецца да раскрыцця ўнутранага свету індывіда [34].

Храналагічныя межы дадзенага артыкула вызначаюцца дастаткова дакладна. Ніжняя мяжа абумоўлена пачаткам этнаграфічнага этапу даследавання паўсядзённасці; верхняя мяжа – 1970-я гг., калі ў Заходняй Еўропе і ЗША адбываўся антрапалагічны паварот і паўсядзённасць вылучылася ў асобны кірунак гістарычнай навукі.

Паўсядзённасць у кантэксце этнаграфічнага этапу разумелася як простая з'ява, якая ўсведамлялася ў якасці сукупнасці сацыяльных і духоўных практык, матэрыяльнага асяроддзя на пэўным гістарычным фоне. Галоўнай адметнасцю этнаграфічнага этапу стала фіксацыя бачных праяў жыцця – матэрыяльнай культуры, сацыяльных практык, рэчавага атачэння і інш. [25, с. 37]. У межах гэтага этапу не адбывалася глыбіннага пагружэння ў ментальнасць, але апісваўся вонкавы бок жыцця.

Этнаграфічны этап працягваўся да 1910-х гг. і супаў з панаваннем у еўрапейскай гуманітарыстыцы пазітывізму як навуковай парадыгмы, мэтай якой было стварэнне дакладнага і разгорнутага наратыву з апорай на максімальную колькасць крыніц (гарантыя навуковай аб'ектыўнасці і паўнаты). Названы напрамак выявіўся ў краінах Еўропы ў працах шэрага вучоных. Унікальныя матэрыялы былі сабраны французскім гісторыкам П. Гіро (1850–1907), які ў работах «Быт і норавы старажыт-

ных грэкаў» (1890) і «Асабістае і прыватнае жыццё рымлян» (1893) [7; 8] спрабаваў апісаць розныя бакі сацыяльнага жыцця людзей Антычнасці. Нямецкі вучоны Э. Фукс (1870–1940) у працы «Ілюстраваная гісторыя нораваў» (1909–1912), спасылаючыся на гістарычныя крыніцы, сабраў цікавыя звесткі пра норавы і звычаі еўрапейцаў у розныя часы (ад эпохі Рэнесансу да Новага часу) [31–33]. У Расіі этнаграфічны этап вывучэння паўсядзённасці знайшоў адлюстраванне ў кнігах М. І. Пыляева (1842–1899) [22], М. І. Кастамарава (1817–1885) [17], І. Я. Забеліна (1820–1908) [13], У. А. Гіляроўскага (1855–1935) [6] і інш. Напрыклад, у працы «Масква і масквічы» (1926) У. Гіляроўскі раскрывае традыцыі, побыт і норавы жыхароў горада ў другой палавіне XIX – пачатку XX ст.

На беларускіх землях этнаграфічны этап выявіўся ў творы П. М. Шпілеўскага (1823–1861) «Вандроўка па Палессі і Беларускім краі» (1853–1855) [37], дзе паказана ўнікальнае культурнае асяроддзе Палесся; працы Канстанціна Тышкевіча «Вілія і яе берагі» (1858) [29], на старонках якой рэпрэзентуюцца старажытныя замкі, гарадзішчы Беларусі, таксама элементы народнай культуры, такія як танцы, спевы, прыпеўкі і інш.; у рабоце А. Г. Кіркора (1818–1886) «Этнаграфічны погляд на Віленскую губернію» (1858), дзе адлюстравана сацыяльнае жыццё людзей гістарычнай Віленшчыны [42]. Пра паўсядзённасць як адметную сферу жыцця беларусаў (асаблівасці вусна-паэтычнай творчасці, самабытны характар) вядома з «Беларускага зборніка» (1885–1912) Е. Р. Раманава (1855–1922) [24], фундаментальнай кнігі «Беларусы» (1903–1922) Я. Ф. Карскага (1860–1931) [16].

Такім чынам, да пачатку XX ст. у рамках этнаграфічнага этапу, упісанага ў пазітывісцкую парадыгму з яе акцэнтаваннем аб’ектыўнасці ведаў і дэталёвым апісаннем жыцця, быў зроблены значны ўнёсак у распрацоўку паняцця «паўсядзённасць».

І Сусветная вайна і іншыя падзеі пачатку XX ст. паказалі, што гістарычная навука не здольная растлумачыць глыбінныя прычыны дзеянняў чалавека, таму пакінула за сабою права фіксацыі фактаў. Гэта прывяло да крызісу пазітывізму і, на думку прафесійных гісторыкаў, да вывучэння паўсядзённасці. У канцы 1910-х гг. у еўрапейскай гуманітарыстыцы адбыўся пераход да гістарычнага этапу даследавання паўсядзённасці, які супаў з развіццём новых філасофскіх кірункаў, як неапазітывізм, неаканцыянства, і фенаменалогіі, што ўвасобілася ў працах Э. Гусэрля (1859–1938) [23; 27, с. 17].

У 1911 г. у артыкуле «Філасофія як строгая навука» [12] Э. Гусэрль агучвае тэзіс «Назад, да саміх рэчаў» [цыт. па: 18], якім заклікае пераасэнсаваць сутнасць элементаў навакольнага жыцця, прааналізаваць і знайсці іх сапраўднае першаснае значэнне.

Свет, напоўнены непераасэнсаванымі элементамі, адкрывае шырокія гарызонты для рэфлексіі наконт будучыні і абсалютную свабоду выба-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ру, як развівацца далей. Такі навакольны, але непазнаны свет у працы «Картэзіянскія роздумы» (1931) атрымаў назву «жыццёвага свету» [11]. Ён непазнаны, пакуль не дае адказу, куды і як рухацца далей, а таму вымушае чалавека пазнаваць сябе. Гэта сведчыла аб гнасеалагічным аптымізме: чалавек можа атрымаць веды пра любы прадмет ці з'яву рэчаіснасці.

Тэза «жыццёвага свету» дала магчымасць змяніць гістарычную парадыгму і ад звычайнага апісання вонкавых элементаў жыцця перайсці да асэнсавання і імкнення ўбачыць іх вачыма людзей вывучаемай эпохі і краіны. Адным з першых пачаў аналізаваць праявы жыцця такім чынам філосаф Ё. Хёйзінга (1872–1945). У трактаце «Восень Сярэдневякоўя» (1919) ён звяртаецца да эматыўнага боку жыцця чалавека і тлумачыць яго паводзіны і ўчынкі выключна эмоцыямі. Чалавек раскрываецца перад намі як клубок душэўных супярэчнасцей: з аднаго боку, жыццё зямное, але яно наскрозь прасякнута думкамі аб жыцці нябесным, мары аб подзвігу і каханні суседнічаюць з узорамі смерці. Так, у главе «Пачуццё прыгожага» прыводзіцца прыклад з жыцця французскага пісьменніка XIV ст. Жана Фруасара. Ён «занадта заняты сваімі бясконцымі аповедамі…», для яго гэта асноўная дзейнасць і, у пэўнай ступені, пабытавая нястача. З іншага боку, праява святочнага – «…ёсць відовішча, якое кожны раз выклікае ў яго словы радаснага захаплення: гэта судны, якія калыхаюцца на хвалях, паказваючы свае трапяткія сцягі і вымпелы, квяцістыя эмблемы, азораныя сонцам» (пераклад наш. – *В. С.*) [34, с. 464]. Такая эмацыянальная разнастайнасць насычае жыццё зместам, ратуючы чалавека ад бессэнсоўнага і шэрага існавання.

Нягледзячы на тое, што паўсядзённасць не выступае ў ролі самастойнай катэгорыі, яна адыгрывае ролю сістэмаўтваральнага элемента, які аб'ядноўвае вялікую колькасць асобных праяў жыцця (напрыклад, побытавых нястач) і стварае яго цэласную карціну. Іншымі словамі, паўсядзённасць – гэта тое, як чалавек успрымае навакольны свет, сукупнасць яго асабістых уяўленняў аб маральных катэгорыях, сацыяльных практыках, стаўленні да жыццёвых праяў. Такая ідэя ў далейшым даследавалася Ф. Брадэлем (1902–1985) у катэгорыі «час вялікай працягласці». У дадзеным рэчышчы, паўсядзённасць – унікальная для кожнага чалавека і не паўтараецца, нягледзячы на пэўныя калектыўныя ўяўленні.

Выяўленне агульных механізмаў існавання чалавека, распачатае Ё. Хёйзінгам, працягнулася ў дзейнасці прадстаўнікоў школы «Аналаў» («Новай гістарычнай школы»), якая сфарміравалася вакол заснаванага ў Францыі ў 1929 г. часопіса «Аналы эканамічнай і сацыяльнай гісторыі».

Адной з фундаментальных ідэй прадстаўнікоў школы «Аналаў» стала сувязь мінулага і сучаснасці. Яна дазваляе меркаваць, што на падставе механізмаў існавання, выпрацаваных чалавекам у мінулым, магчы-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ма прааналізаваць і пазнаць жыццё чалавека не толькі ў мінулым, але і ў сучаснасці. Працы прадстаўнікоў першага пакалення школы «Аналаў» шмат у чым паўтараюць пытанні, узнятыя ў «Восені Сярэдневякоўя».

М. Блок (1886–1944) у працы «Каралі-цудатворцы» (1924) звяртаецца да калектыўнай ментальнасці, якая, як уяўляецца, фарміруецца на эматыўным успрыманні жыцця [3; 28]. Манарх, які лечыць людзей ад залатухі прыкладаннем рук, выступае ў рабоце ў якасці шматпланавага жыццёвага сюжэта. Але галоўнае – адлюстраванне «калектыўнага бессвядомага», якое вызначае характар грамадства. Важнымі праявамі такога бессвядомага выступаюць спосаб мыслення і адчування, духоўнае і псіхічнае жыццё, да якога толькі прыкладаюцца эканоміка, геаграфія і іншыя з'явы матэрыяльнага жыцця. Даследаванне калектыўнай ментальнасці ў «Каралях-цудатворцах» аказала ўплыў на фарміраванне гістарычнай антрапалогіі, якая ў 1970-х гг. вылучылася ў асобны напрамак вывучэння гісторыі [35].

У падобным рэчышчы разглядае праблему і Л. Феўр (1878–1956) [14]. Для яго на першы план выходзіць індывідуальная, а не калектыўная ментальнасць, яна будуецца на псіхалагічным партрэце чалавека. Каб выявіць такую ментальнасць, ён карыстаецца «вертыкаллю псіхалагічнай узаемасувязі», дзе ніжняя мяжа – устаноўкі, якія чалавек атрымлівае пры нараджэнні, а верхняя – вынік жыцця, псіхалагічны стан пасля перажытых падзей. Такая вертыкаль дапамагае выявіць агульныя механізмы існавання чалавека [30].

Прадстаўнікі першага пакалення «аналістаў» у поглядах былі блізкія да юнгаўскай ідэі «калектыўнага бессвядомага» і імкнуліся наблізіцца да разумення агульных характарыстык псіхалогіі людзей эпохі. Паўсядзённасць у гэтым рэчышчы можа разглядацца як асабовы сусвет, які будуецца на эматыўных уяўленнях аб навакольным свеце.

Развіваючы ідэі М. Блока, прадстаўнік другога пакалення школы «Аналаў» Ф. Брадэль прапанаваў вылучыць у жыцці чалавека два ўзроўні – матэрыяльны і нематэрыяльны. Матэрыяльныя праявы (клімат, гаспадарка, харчаванне, жыллё, вопратка, крыніцы энергіі і г. д.) выступалі ў якасці важнейшых складаючых, на аснове якіх развівалася жыццё чалавека. Нематэрыяльныя праявы жыцця былі названыя ім «структурамі паўсядзённасці» [4]. Уласна кажучы, менавіта Ф. Брадэль стаў першым даследчыкам, які выкарыстаў канцэпт «паўсядзённасць» у справе вывучэння жыццёвага свету.

Разам з тым у даследаваннях Ф. Брадэля фарміруецца ідэя «татальнай гісторыі», грандыёзнай, усеабдымнай, якая ўключае ў сябе ўсе сацыяльныя, эканамічныя і вытворчыя сувязі, маральныя праявы, сацыяльную структуру грамадства і інш. У яе межах з'явілася ўсведамленне мінулага як «гісторыі знізу», што зрабіла прадметам гістарычнага да-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

следавання «маленькага чалавека», а не «вяршкоў» грамадства [1]. З гэтага часу звычайныя людзі і нават маргіналы сталі перыядычна з'яўляцца ў еўрапейскай гуманітарыстыцы. Ментальнасць «маленькага чалавека» была цэнтрам увагі нямецкіх даследчыкаў у канцы XX ст.

Некаторыя з нематэрыяльных праяў жыцця (мараль, рэлігійныя ўяўленні і інш.) у структураваным выглядзе разглядаюцца ў якасці ментальнасці. У Ф. Брадэля ментальнасць выступае ў ролі цямніцы, у якой схаваны «час вялікай працягласці» (гістарычны час), які вылучае эпоху ці перыяд з часавага кантынуума ці плыні [15]. На падставе сукупнасці складнікаў ментальнасці можна вызначыць агульныя механізмы існавання чалавека ў розныя часы: гэта асаблівасці рэлігійных уяўленняў, стаўленне да смерці, асалодаў, сямейнага жыцця, працы і г. д.

Такая канцэпцыя дае магчымасць зразумець, што паўсядзённасць у поглядах Ф. Брадэля – своеасаблівы «дух часу», ментальнасць, якая абмяжоўвае чалавека той ці іншай эпохі ў пэўных храналагічных межах.

Э. Лабрус (1895–1988) у кантэксце даследавання паўсядзённасці прапанаваў падзяліць увесь гістарычны матэрыял на тры ўзроўні: эканамічны, сацыяльна-палітычны і грамадскай свядомасці. Першы ўзровень хутказменлівы і патрабуе пастаяннай актуалізацыі і пераасэнсавання, другі («узровень сярэдняга часу») больш устойлівы да змен, трэці – кансерватыўны. Такім чынам, Э. Лабрус спрабаваў знайсці навуковае абгрунтаванне разрывам часу. Паўсядзённасць для яго не была наборам ментальнасцей, якія павольна змянялі адна адну. Гістарычнае развіццё для даследчыка – няспынны працэс, у якім эканамічны складнік змяняецца вельмі хутка, сацыяльна-палітычны – больш запаволены, а грамадская свядомасць уяўляецца надзвычай нязменлівай структурай. Такая сістэма стварае гарызантальныя сувязі ў гістарычным працэсе і не дае адбыцца рэвалюцыйным зменам [43].

Брадэлеўскую ідэю «часу вялікай працягласці» развіў вучань Л. Феўра Р. Мандру (1921–1984). У працы «Магістраты і ведзьмакі ў Францыі ў XVII ст. Аналіз калектыўнай псіхалогіі» (далей – «Магістраты») ён звярнуўся да глыбокіх змен у свядомасці і ладзе мыслення чалавека XVII ст. і распрацаваў тэзу аб «ментальнай рэвалюцыі» [21].

У сюжэтах «Магістратаў» ментальная рэвалюцыя паўстае як мяжа паміж сярэдневяковай свядомасцю, поўнай забабонаў, веры ў д'ябла і экзарцызм, і больш скептычнай свядомасцю чалавека Новага часу. Паводле поглядаў Р. Мандру, ментальная разнароднасць, уласцівая эпосе Новага часу, узнікла ў выніку інтэлектуальнага і рэлігійнага крызісу XVI ст.

Трэці этап дзейнасці школы «Аналаў» даследчыкі звязваюць з грунтоўнымі зменамі ў еўрапейскай гуманітарыстыцы. Палітычны кантэкст 1960-х гг. у Францыі, верагодна, стаў адной з прычын антрапалагічнага павароту ў навуцы і культуры, які паставіў на першае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

месца ў гістарычных даследаваннях уяўленні чалавека аб свеце, а таксама матэрыяльныя і нематэрыяльныя аспекты яго жыцця. Найбольш вядомымі прадстаўнікамі гэтага пакалення сталі вучні Э. Лабруса Ж. Ле Гоф (1924–2014) і Ж. Дзюбі (1919–1996).

Ж. Ле Гоф у даследаваннях, прысвечаных еўрапейскаму Сярэдневякоўю, звяртаецца да аналізу грамадства праз вялікую колькасць элементаў жыцця: успрыманне чалавекам часу і прасторы, уяўленні аб багацці і беднасці, духоўны вопыт, эканамічныя змены і сацыяльная структура [20]. У такім разуменні ментальнасці вучоны блізкі да канцэпцыі «татальнай гісторыі» Ф. Брадэля, якую дапаўняе «суб'ектыўным вобразам» [19]. Менавіта Ж. Ле Гоф стаў адным з першых, хто звярнуўся да даследавання двух тыпаў рэальнасці: гістарычнай і ўяўленняў (як яе ўспрымае чалавек у кожную эпоху праз менталітэт). Функцыянаванне чалавека ва ўмовах дзвюх рэальнасцей прыводзіць да таго, што ў грамадстве выпрацоўваюцца аўтаматычныя праявы жыцця, тое агульнае, што аб'ядноўвае ўмоўных святара і прыхаджаніна царквы, манарха і звычайнага чалавека. Гэта – паўсядзённасць у спадчыне прадстаўнікоў «трэціх аналістаў».

У СССР пытаннямі ментальнасці першым пачаў займацца А. Я. Гурэвіч (1924–2006). Цэнтральнай праблемай гісторыі ментальнасцей ён лічыў вывучэнне і рэканструкцыю карціны свету чалавека мінулага, якая паўстае ў выглядзе эматыўных практык: успрымання навакольнага асяроддзя, стаўлення да працы, трактоўкі прасторы і часу, формы рэлігійнасці і г. д. Ментальнасць у А. Гурэвіча будуецца на «восі», своеасаблівым падмурку, які залежыць ад тыпу культуры [10, с. 20]. Гэтыя ідэі больш поўна раскрыліся ў культурнай антрапалогіі апошняй чвэрці XX ст.

Дзейнасць прадстаўнікоў школы «Аналаў» храналагічна супала са структуралізмам і дыскурсіўным ці лінгвістычным паваротам. Прыкладна з 1960-х гг. мова пачала разглядацца не ў якасці сродку зносін, а як звязаная сукупнасць знакаў культуры. У культурным сэнсе чалавек існуе ў свеце знакаў, яны ўплываюць на свядомасць і менталітэт. У межах гэтай ідэі з'яўляецца катэгорыя «дыскурсу» – вялікага блока тэкстаў – знакаў сістэмы, якія адрасуюцца ад аднаго да другога чалавека і грамадства і наадварот. Такім чынам, дыскурс як увасобленая ў мове свядомасць, з аднаго боку, фарміруе менталітэт чалавека, з другога – сам з'яўляецца вынікам разнастайных сацыяльных практык.

Адзін з вядучых прадстаўнікоў «лінгвістычнага павароту» К. Гірц (1926–2006) у кнізе «Інтэрпрэтацыя культур» (1973) выказвае думку, што чалавечая культура ўяўляе сабой ансамбль тэкстаў [9]. Галоўнай праблемай у дадзеным рэчышчы бачыцца мова, якой ствараліся гэтыя тэксты і як яны інтэрпрэтаваліся ў розныя часы. Ці можа даследчык быць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

упэўненым, што сучаснае яму разуменне тэксту і яго першаснае значэнне – аднолькавыя? Адсюль вынікае, што, вывучаючы пэўную эпоху, яе людзей і ментальнасць, даследчыку неабходна расшыфраваць мову, якой карысталіся людзі гэтай эпохі.

На мяжы 1960–1970-х гг. адносіны паміж чалавекам і грамадствам разглядаліся двума паралельнымі шляхамі: праз сацыялогію і псіхалогію. Шлях да вывучэння ментальнасці ў Ж. Дзюбі і Л. Феўра – праз псіхалогію [36]. Погляды Л. Феўра былі блізкія да ідэй, якія ў 1960-я гг. сфарміраваліся ў онтапсіхалогію (псіхалогію быцця), а Ж. Дзюбі – да псіхааналізу З. Фрэйда.

У сацыяльным кантэксце ўзаемадзеянне паміж чалавекам і грамадствам разглядалася яшчэ з першай трэці XX ст. Канцэпт «жыццёвага свету», згодна з сацыёлагам А. Шуцам (1899–1959), уяўляецца не проста светам прадметаў вакол індывідума, а тым, як мы яго ўспрымаем [38]. Ён складаецца з руцінных дзеянняў, моўных канструктаў, з дапамогай якіх людзі катэгарызуюць паўсядзённы вопыт і паведамляюць аб ім.

Адзін з вядучых прадстаўнікоў гістарычнай сацыялогіі Н. Эліяс (1897–1990) разглядае паўсядзённасць праз «сацыяльныя фігурацыі» – формы жыцця людзей, якія канструююць новую сацыяльную рэальнасць [40]. Б. Вальдэнфельс (нар. 1934) новы від рацыянальнасці тлумачыць рэспанзітыўнасцю (тэорыяй адказу), згодна з якой пануе не адзіны «абсалютны» розум, а мноства рацыянальнасцей, што сустракаюцца ў прасторы, кожная з якіх абмежавана рамкамі [5]. П. Бергер (1929–2017) і Т. Лукман (1927–2016) у даследаванні «Сацыяльнае канструяванне рэальнасці...» раскрываюць паўсядзённасць у якасці суб’ектыўна значнай для чалавека рэальнасці [2; 39].

З канца 1950-х гг. гістарычныя даследаванні насычаюцца ідэямі эканомікі і статыстыкі, што прывяло да фарміравання ў 1960-х гг. кліаметрыкі. Прадстаўнікі гэтага кірунку тлумачылі гісторыю з пункту гледжання эканамічнай тэорыі і колькасных метадаў. Р. Фогель (1926–2013) на падставе матэматычных выкладак аналізуе неабходнасць пабудовы чыгунак у XIX ст. для павышэння эканамічнага росту ЗША. А для параўнання ён выводзіць гіпатэтычную мадэль: краіна без такой чыгункі [41]. У аснову гэтай мадэлі пакладзена ідэя грамадскага зберажэння чыгунак.

Цікавае спалучэнне метадаў, упершыню інтэграваных кліаметрыкамі, стала выкарыстоўвацца і ў іншых напрамках сацыяльнай гісторыі, асабліва дэмаграфічнай гісторыі, у цэнтры ўвагі якой змена пакаленняў, дынаміка міграцый і выкліканыя імі сацыяльныя змены. У межах дэмаграфічнай гісторыі матэматычныя метады дазволілі вылучыць унутраныя заканамернасці з’яў і працэсаў, распрацаваць методыку збору і аналізу звестак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з тым да канца 1970-х гг. сацыяльная гісторыя, нягледзячы на выкарыстанне розных падыходаў, так і не змагла знайсці шляхі да ўсеабдымнага апісання жыцця чалавека. З гэтага часу кліяметрычны падыход дапаўняе гісторыю ментальнасці, а ў далейшым гэтыя працэсы прыводзяць да фарміравання субдысцыпліны, з'яўлення маштабнага напрамку ў гуманітарных ведах – культурнай антрапалогіі, якая пачынае якасна новы этап у даследаванні паўсядзённага жыцця чалавека.

У пачатку 1970-х гг. пад уплывам школы «Аналаў» і новай гістарычнай школы ў Заходняй Германіі паўсядзённая гісторыя вылучылася ў асобны навуковы напрамак – гісторыю паўсядзённасці (alltagsgeschichte) [18]. У Еўропе пачалі фарміравацца нацыянальныя школы дадзенага кірунку. У 1980-я гг. у Аўстрыі былі створаны Інстытут вывучэння рэалій позняга Сярэдневякоўя і ранняга Новага часу, Міжнароднае таварыства «Medium Aevum Quotidianum» [26, с. 16]. Найбольшы рэзананс атрымалі нямецкая і італьянская школы, далейшае развіццё ўяўлення аб паўсядзённасці ў якіх адбывалася ў межах мікрагісторыі і ментальнасці «маленькага чалавека».

Такім чынам, з канца XIX да сярэдзіны XX ст. канцэпт паўсядзённасці адчуў цэлы шэраг трансфармацый: у рамках этнаграфічнага этапу ён трактаваўся як вонкавы бок жыцця і набор устойлівых звычак. З крызісам пазітывізму адбыўся пераход да яго фенаменалагічнага асэнсавання – паўсядзённасць як сукупнасць асабістых уяўленняў чалавека аб маральных катэгорыях, сацыяльных практыках, як стаўленне да жыццёвых праяў. Першае пакаленне школы «Аналаў» (М. Блок, Л. Феўр) разглядала паўсядзённасць як асабовы сусвет, які будуецца на эматыўных уяўленнях аб навакольным свеце; другое (Ф. Брадэль, Э. Лабрус, Р. Мандру) – у кантэксце ментальнасці; трэцяе (Ж. Ле Гоф) – як аўтаматычныя праявы жыцця. З дыскурсіўным паваротам 1960-х гг. паўсядзённасць стала ўсведамляцца як сукупнасць тэкстаў чалавека пэўнай эпохі, якія неабходна расшыфраваць. З 1970-х гг. з развіццём сацыяльнай гісторыі і яе ўвагай да разнастайных аспектаў жыцця чалавека ў еўрапейскай культуралагічнай думцы пачалі фарміравацца падмуркі, на якіх з 1980-х гг. развіваецца культурная антрапалогія.

1. *Банникова, Е. В.* Повседневность как объект исторического исследования [Электронный ресурс] / Е. В. Банникова // Russian Journal of Education and Psychology. – 2011. – № 3. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/povsednevnost-kak-obekt-istoricheskogo-issledovaniya. – Дата доступа: 14.03.2021.

2. *Бергер, П.* Социальное конструирование реальности. Трактат по социологии знания : пер. с нем. / Питер Бергер, Томас Лукман. – М. : Моск. филос. фонд, 1995. – 323 с.

3. *Блок, М.* Короли-чудотворцы: Очерк представлений о сверхъестественном характере королев. власти, распространен. преимущественно во Франции и в Англии /

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Марк Блок ; предисл. Ж. Ле Гоффа ; послесл. А. Я. Гуревича ; пер. с фр. В. А. Мильчиной. – М. : Яз. рус. культуры, 1998. – 709 с.

4. *Бродель, Ф.* Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII вв. : в 3 т. / Фернан Бродель ; пер. с фр. Л. Е. Куббеля ; вступ. ст. и ред. Ю. Н. Афанасьева. – М. : Прогресс, 1986. – Т. 1 : Структуры повседневности: возможное и невозможное. – 1986. – 622 с.

5. *Вальденфельс, Б.* Повседневность как плавильный тигль рациональности / Б. Вальденфельс // Социо-Логос. – М., 1991. – С. 39–50.

6. *Гиляровский, В. А.* Москва и москвичи / В. А. Гиляровский. – Минск : Выш. шк., 1981. – 350 с.

7. *Гиро, П.* Быт и нравы древних греков : пер. с фр. / Поль Гиро. – Смоленск : Русич, 2002. – 619 с.

8. *Гиро, П.* Частная и общественная жизнь римлян / Поль Гиро ; пер. с фр. С. П. Моравского. – М. : Вече, 2019. – 496 с.

9. *Гирц, К.* Интерпретация культур : пер. с англ. / К. Гирц. – М. : Рос. полит. энцикл., 2004. – 560 с.

10. *Гуревич, А. Я.* От истории ментальностей к историческому синтезу / А. Я. Гуревич // Споры о главном. Дискуссии о настоящем и будущем исторической науки вокруг французской школы «Анналов» / отв. ред. Ю. Л. Бессмертный. – М. : Наука, 1993. – 207 с.

11. *Гуссерль, Э.* Картезианские размышления / Эдмунд Гуссерль ; пер. с нем. Д. В. Скляднева. – СПб. : Наука, 2006. – 315 с.

12. *Гуссерль, Э.* Философия как строгая наука / Эдмунд Гуссерль. – Новочеркасск : Сагуна, 1994. – 357 с.

13. *Забелин, И. Е.* История русской жизни с древнейших времен / И. Е. Забелин. – М. : Эксмо, 2008. – 608 с.

14. *Зверев, О. В.* Историческая школа «Анналов» о ментальности / О. В. Зверев // Вестн. МГУКИ. – 2011. – № 6 (44). – С. 44–47.

15. *Ипполитов, Г. М.* История повседневности: некоторые аспекты генезиса и эволюции отрасли исторической науки [Электронный ресурс] / Г. М. Ипполитов, А. И. Репинецкий // Известия Самарского науч. центра РАН. – Т. 14, № 3, 2012. – С. 154–161. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/istoriya-povsednevnosti-nekotorye-aspekty-genezisa-i-evolyutsii-otrasli-istoricheskoy-nauki. – Дата доступа: 19.03.2021.

16. *Карский, Е. Ф.* Белорусы : в 3 т. / Е. Ф. Карский. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2006–2007. – Т. 3 : Очерки словесности белорусского племени, кн. 1. – 2007. – 581 с.

17. *Костомаров, Н. И.* Быт и нравы русского народа / Н. И. Костомаров. – М. : Э, 2016. – 398 с.

18. *Кром, М. М.* Повседневность как предмет исторического исследования / М. М. Кром // История повседневности : сб. науч. работ / отв. ред. М. М. Кром. – СПб., 2003. – Вып. 3. – С. 7–14.

19. *Крюков, А. В.* История повседневности во взглядах основателей школы «Анналов» [Электронный ресурс] / А. В. Крюков // Гуманитарные научные исследования. – 2016. – № 1 (63). – С. 54–61. – Режим доступа: http://human.snauka.ru/2016/11/17640. – Дата доступа: 15.09.2020.

20. *Ле Гофф, Ж.* Другое Средневековье : Время, труд и культура Запада / Жак Ле Гофф. – Екатеринбург : Изд-во Уральского ун-та, 2002. – 327 с.

21. *Мандру, Р.* Магистраты и колдуны во Франции в XVII в. Анализ коллективной психологии / Р. Мандру // История ментальностей, историческая антропология. Зарубежные исследования в обзорах и рефератах. – М., 1996. – С. 174–179.

22. *Пыляев, М. И.* Старое житье: Очерки и рассказы о бывших в отшедшее время обрядах, обычаях и нарядах в устройстве домашней и общественной жизни / М. И. Пыляев. – М. : Книга, 1990. – 321 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*23. Радионова, С. В.* Повседневность как поле репрезентации социальной реальности / С. В. Радионова // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Серыя 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – Мінск, 2002. – № 1. – С. 51–56.

*24. Романов, Е. Р.* Белорусский сборник : в 9 вып. / Е. Р. Романов. – Киев : Тип. С. В. Кульженко, 1885–1912. – Вып. 9 : Быт белоруса. Опыт словаря условных языков Белоруссии, 1912. – 124 с.

*25. Сідаровіч, В. С.* Канцэпт паўсядзённасці ў еўрапейскай культуры (ад старажытнасці да сярэдзіны XIX ст.) / В. С. Сідаровіч // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2020. – № 2. – С. 36–46.

*26.* Социальная история. Ежегодник, 2007 / сост. И. Ю. Новиченко ; отв. ред. Н. Л. Пушкарева. – М. : РОССПЭН, 2008. – 368 с.

*27.* Теория и методология истории : учебник для вузов / отв. ред. В. В. Алексеев [и др.]. – Волгоград : Учитель, 2014. – 504 с.

*28. Трофимов, А. В.* История повседневности в исторической науке: историографический аспект / А. В. Трофимов, А. В. Жданов // Урал индустриальный. Бакунинские чтения : материалы VIII Всерос. науч. конф., Екатеринбург, 27–28 апр. 2007 г. – Екатеринбург, 2007. – Т. 1. – С. 83–88.

*29. Тышкевіч, К.* Вілія і яе берагі / Канстанцін Тышкевіч. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 636 с.

*30. Февр, Л.* Бои за историю / Люсьен Февр ; пер. с фр. А. А. Бобровича [и др.]. – М. : Наука, 1991. – 629 с.

*31. Фукс, Э.* Иллюстрированная история нравов. Галантный век : пер. с нем. / Эдуард Фукс. – М. : Республика, 1994. – 479 с.

*32. Фукс, Э.* Иллюстрированная история нравов: Буржуазный век : пер. с нем. / Эдуард Фукс. – М. : Терра, 1996. – 441 с.

*33. Фукс, Э.* Иллюстрированная история нравов: Эпоха Ренессанса : пер. с нем. / Эдуард Фукс. – М. : Терра, 1996. – 512 с.

*34. Хёйзинга, Й.* Осень Средневековья: исследование форм жизненного уклада и форм мышления в XIV и XV веках во Франции и Нидерландах / Йохан Хёйзинга ; сост., предисл. и пер. с нидерл. Д. В. Сильвестрова. – СПб. : Изд-во Ивана Лимбаха, 2011. – 767 с.

*35. Хромова, Е. Б.* Вспоминая Марка Блока [Электронный ресурс] / Е. Б. Хромова // Технологос. – 2015. – № 1. – С. 24–32. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/vspominaya-marka-bloka. – Дата доступа: 24.04.2021.

*36. Шенкао, М. А.* Изучение ментальностей во французской школе «Анналов» / М. А. Шенкао // Общество. Среда. Развитие (Terra Humana). – 2009. – № 1. – С. 60–72.

*37. Шпилевский, П. М.* Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск : Беларусь, 2004. – 251 с.

*38. Шюц, А.* Структура повседневного мышления / Альфред Шюц ; пер. с англ. Е. Д. Руткевич // Социологические исследования. – 1988. – № 2. – С. 120–136.

*39. Щербакова, Л. В.* Культура повседневности: материальная структура / Л. В. Щербакова // Вестн. Астраханского гос. техн. ун-та. – 2013. – № 1 (55). – С. 92–96.

*40. Элиас, Н.* Общество индивидов : пер. с нем. / Норберт Элиас. – М. : Праксис, 2001. – 331 с.

*41. Fogel, R. W.* The Union Pacific Railroad: A Case in Premature Enterprise / Robert W. Fogel. – Baltimore : Johns Hopkins Univ. Press, 1960. – 129 p.

*42. Kirkor, A. H.* Przechadzki po Wilnie i jego okolicach / A. H. Kirkor. – Wilno : Nakł. M. Orgelbranda, 1859. – 384 p.

*43.* Histoire économique et sociale de la France. – Vol. 4 / edit.: Fernand Braudel and Ernest Labrousse. – Paris : Presses Univ. de France, 1970. – 424 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*V. Sidarovich*

**Concept of everyday life in European cultural studies (from the middle 19th to the second half of 20th centuries)**

*The article is devoted to the development of the concept of "everyday life" and relevant approaches to its study in foreign and domestic social sciences. The author identified the essence, content and features of everyday life, which are manifested in the attitude of man to life phenomena in relation to socio-cultural processes. The views of the representatives of the ethnographic and historical stages of the study of the phenomenon of everyday life, which corresponds to the positivist and phenomenological directions in philosophy, as well as the research of the "Annals" school, are revealed.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 21.06.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ